Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа»

# ЛЕПШАГА НЯМА ЗА РОДНЫ КРАЙ
(гутарка)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

 аг. Грыцкевічы, 2022

Праграмныя задачы: сістэматызаваць уяўленні дзяцей аб родным краі; развіваць увагу, мысленне, уяўленне, мову; выхоўваць любоў да роднага краю.

Ход занятку:

(На сталах карткі з выявай гнязда, дупла, бярлогі, нары)

- Дзеці, паглядзіце, на картках вы бачыце домікі. Чые гэта домікі? Хто ў іх жыве? (Адказы дзяцей)

- Дзе жыве птушка? (У гняздзе)

- З чаго пабудавана гняздо? (З галінак, саломы, пуху, футра)

- Хто пабудаваў птушцы гняздо? (Сама пабудавала)

- Дзе жыве вавёрка? (У дупле)

- Хто пабудаваў вавёрцы домік? (Сама знайшла дупло ў старым дрэве, нанасіла ў дупло травы, моху)

- Дзе жыве мядзведзь? (У бярлозе)

- Хто яму знайшоў дом? (Сам сабе знайшоў ямку, нацягаў галінак, лісця, дабудаваў сабе сховішча)

- А дзе жыве ліса? (У нары)

- Хто ёй нару пабудаваў? (Сама лапкамі вырыла)

- Усе звяры рассяліліся па сваіх хатках.

- Для чаго патрэбен дом птушцы, лісе, мядзведзю, вавёрцы? (Каб хавацца ад ворагаў, захоўваць запасы харчавання, адпачываць, спаць, хавацца ад холаду)

- Дзеці, а ў вас ёсць дом? (Ёсць)

- З чаго зроблены ваш дом? (З цэглы, бярвення, камянёў)

- Які ваш дом? (Вялікі, маленькі, высокі)

- У людзей дамы аднолькавыя ці розныя. А хто будуе людзям дамы? (Адказы дзяцей)

- Хто пабудаваў ваш дом (тата, дзядуля, будаўнікі)

- Людзі самі будуюць сабе дамы.

- Вы адны жывяце ў доме ці яшчэ хтосьці з вамі жыве? (браты, сёстры, тата, мама, бабуля, дзядуля)

- Вы сябруеце з суседзямі? (Так)

- Вы дома любіце гуляць? (Так)

- А дзе яшчэ можна пагуляць? (На гульнёвай пляцоўцы, у двары)

- Вось добра! У кожнага з вас ёсць свой двор каля дома.

- З кім вы там гуляеце? (З суседскімі дзецьмі)

- У якія гульні вы гуляеце? (бегаем, гуляем мячом, гуляем у пясочніцы)

- Вельмі прыемна гуляць у сваім двары са сваімі сябрамі. Цікава, у каго самы прыгожы двор? (Адказы дзяцей: таму што ёсць арэлі, лавачкі, дрэвы, летам каляровыя кветкі)

- А вы кідаеце смецце ў сваім двары? (Адказы дзяцей)

- Малайцы! У доме павінна быць чыста, прыгожа.

- Дзеці, памятаеце, мы рабілі з вамі домікі.

- Вось колькі домікаў і ўсе розныя. Выберыце сабе дом, які больш за ўсё вам падабаецца.

Знайдзіце сваё акенца і прыляпіце кветку - тут ваш дом, у якім вы хочаце жыць.

- А цяпер вазьміце свой домік і пастаўце сюды (выхавальнік разгортвае ватман з планам вуліцы, дзеці расстаўляюць свае домікі, атрымліваецца вуліца)

- Паглядзіце, атрымалася цэлая вуліца. Давайце прыдумаем назву нашай вуліцы (Казачная, Дзіцячая, Мірная, Цацачная)

- У нашай вуліцы зараз ёсць назва.

- Хто ведае, на якой вуліцы жывяце вы са сваёй сям'ёй? (Цэнтральная, Шырокая)

- А наш дзіцячы сад знаходзіцца на вуліцы Інтэрнацыянальная.

- Як шмат вуліц у нашай вёсцы!

- Хто ведае, як называецца аграгарадок, у якім мы жывем (Грыцкевічы)

- Якія яшчэ будынкі ёсць на вуліцах нашага аграгарадка? (крама, школа, сельскі дом культуры, пошта, магазін – сталовая, фізкультурна – аздараўленчы комплекс)

Выхавальнік прапануе разгледзець фотаздымкі, любуюцца прыгажосцю аграгарадка.

- Як шмат цікавага ў вёсцы, так і хочацца куды-небудзь схадзіць, адпачыць, пагуляць.

- Куды б вам, дзеці, хацелася схадзіць у нашым аграгарадку? (Сельскі дом культуры)

- Ну тады разам адпраўляемся на экскурсію.

Гульня «Артысты»

(дзеці спяваюць песні, чытаюць вершы)

- Весела мы правялі час у сельскім доме культуры!

- Дзеці, спадабаўся вам аграгарадок, у якім мы жывём? Чаму? (Ён вельмі прыгожы)

- Давайце ўсе разам паўторым, як называецца наш аграгарадок. (Грыцкевічы)

- А што трэба рабіць людзям, каб ён быў яшчэ прыгажэйшым, чысцейшым. (Не смеціць, саджаць дрэвы, кветкі)

Давайце яшчэ раз палюбуемся макетам нашага аграгарадка. Вось якая прыгажосць!

- Але мне здаецца, што чагосьці не хапае (Дрэў, кветак)

Дзеці прыклейваюць дрэвы каля сваіх дамоў. Выхавальнік прыклейвае некалькі птушачак. Выставіць фігуркі дзяцей з кардона, размеркаваць іх каля пясочніцы, арэляў ...

Можа быць, і ў вас будуць калі-небудзь такія прыгожыя двары.

Любіце і беражыце свой родны край.